Валахановіч, А. І. Славуты беларускі гісторык — наш зямляк. Да 100-годдзя з дня нараджэння М. М. Улашчыка /А. І. Валахановіч// Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI ст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2007. – С. 5-9

**А. І. ВАЛАХАНОВІЧ (Мінск)**

# СЛАВУТЫ БЕЛАРУСКІ ГІСТОРЫК — НАШ ЗЯМЛЯК

## Да 100-годдзя з дня нараджэння М. М. Улашчыка

14 лютага 2006 г. споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага гісторыка, археографа, этнографа, краязнаўца, літаратара Мікалая Мікалаевіча Улашчыка. Ён нарадзіўся 1 (14) лютага 1906 г. у вёсцы Віцкаўшчына Койданаўскай воласці Мінскага павета (цяпер Дзяржынскі раён Мінскай вобласці). Сваімі навуковымі творамі М. М. Улашчык унёс значны ўклад у развіццё беларускай гістарычнай навукі, яго навуковыя даследаванні па гісторыі беларускай вёскі, крыніцазнаўстве і археаграфіі лічацца класічнымі. Ён смела адхіліў архаічныя ўяўленні — штампы пра беларуса, як адсталага, забітага і затурканага чалавека былой Расійскай імперыі, які нібыта ўсё сваё жыццё араў сахою, хадзіў у лыкавых лапцях і заставаўся непісьменным.

У беларускай вёсцы, дзе ўсе сяляне пісьменныя, кожная сям'я мае вялікі надзел зямлі, і тыя, хто працаваў, не галадалі і не хадзілі ў лапцях. Гэта — вёска Віцкаўшчына. Яе ўраджэнцу было чым запярэчыць плакальшчыкам аб забітым, няшчасным беларускім мужыку. М. М. Улашчык належаў да таго пакалення маладых беларускіх вучоных, інтэлігентаў з простага народа, якім выпаў гонар ствараць культуру і навуку маладой беларускай дзяржавы. Улашчык зрабіў за сваё жыццё вельмі многа. Ён — аўтар шэрага манаграфій, кніг па гісторыі сярэдневяковай Беларусі, адкрывальнік старажытных рукапісаў. Калегі і паплечнікі ўспамінаюць, што М. М. Улашчык валодаў уменнем гаварыць на беларускай мове, якой яна была ў XVI ст.



14 лютага 2006 г. у Маскве для маскоўскіх беларусаў адбылася вечарына, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка. Вучоныя-гісторыкі, вучні М. М. Улашчыка, прыхільнікі яго навуковых поглядаў адзначылі вялікую ролю, якую адыграў ён у станаўленні і развіцці гісторыі Беларусі. Вечарына была арганізавана доктарам філалагічных навук, сябрам М.М. Улашчыка, Аляксеем Канстанцінавічам Каўкам і сынам Улашчыка — Аляксандрам Мікалаевічам Улашчыкам. На вечарыне прымала ўдзел і вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута славяназнаўства РАН доктар гістарычных навук Ганна Леанідаўна Харашкевіч.

24—25 лютага 2006 г. у Мінску на гістарычным факультэце БДУ адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя «Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI ст. у Беларусі. Да 100-годдзя з дня нараджэння М.М. Улашчыка».

Гэтую канферэнцыю правялі гістарычны факультэт БДУ, Камітэт па архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы (БелНДІДАС).

Канферэнцыя пачала працу ў 10 гадзін раніцы 24 лютага. На ёй працавалі дакументальная і кніжная выстаўкі, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка. Кожны ўдзельнік канферэнцыі атрымаў праграму Міжнароднай навуковай канферэнцыі.

Адкрыў канферэнцыю дэкан гістарычнага факультэта БДУ кандыдат гістарычных навук, дацэнт Сяргей Мікалаевіч Ходзін.

З кароткаю прамовaю выступіў старшыня Камітэта па архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь кандыдат гістарычных навук Уладзімір Іванавіч Адамушка.

На пленарным пасяджэнні з дакладам «Традыцыі і перспектывы развіцця крыніцазнаўства ў БДУ» выступіў С. М. Ходзін. Ён адзначыў, што ў час працы канферэнцыі плануецца паездка на радзіму М. М. Улашчыка па маршруце Мінск — Дзяржынск — Віцкаўшчына — Грычына.

Загадчык аддзела Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі кандыдат філалагічных навук Вячаслаў Анатольевіч Чамярыцкі выступіў з дакладам «Летапісазнаўчая спадчына Мікалая Улашчыка і праблемы падрыхтоўкі новага выдання беларускіх летапісаў». Дакладчык каля 20 гадоў ведаў М.М.

Улашчыка, працаваў з ім над падрыхтоўкай летапісаў да друку, дапамагаў рыхтаваць да друку кнігу «Хроніка Быхаўца», вёў з ім актыўную перапіску.

З дакладам «Адказнасць гісторыка перад грамадствам. Прыклад М.М. Улашчыка» выступіла вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута славяназнаўства РАН доктар гістарычных навук Ганна Леанідаўна Харашкевіч. Яна адзначыла, што «беларуская гістарычная навука далёка пайшла ад расійскай, але не ад



еўрапейскай». Г. Л. Харашкевіч працавала з М. М. Улашчыкам: ён прысутнічаў пры абароне доктарскай дысертацыі ў якасці навуковага апанента. Дакладчыца прапанавала ўсе творы вучонага, а таксама і яго эпісталярную спадчыну выдаць.

Аб падрыхтоўцы «Летописи истории архивного дела Российской Федерации (1990—2004 гг.)» расказала намеснік дырэктара Усерасійскага НДІ дакументазнаўства і архіўнай справы кандыдат гістарычных навук Ніна Іванаўна Хіміна.

«Камеральная археаграфія і помнікі кніжнай культуры Беларусі: дасягненні, праблемы і перспектывы» — такая была тэма даклада загадчыка аддзела Расійскай нацыянальнай бібліятэкі доктара філалагічных навук Мікалая Віктаравіча Нікалаева.

У час абедзеннага перапынку група навукоўцаў у складзе Г. Л. Харашкевіч, С. М. Ходзіна, аўтара гэтага артыкула, пляменніка М. М. Улашчыка, кандыдата тэхнічных навук, аўтара кніг пра радавод Улашчыкаў і Станішэўскіх, Вячаслава Мікалаевіча Станішэўскага наведала Чыжоўскія могілкі, дзе пахаваны М. М. Улашчык і яго жонка Н. М. Шамарына, і ўсклалі кветкі на магілу вядомых навукоўцаў.

Пасля перапынку працавалі 4 секцыі.

Секцыя 1. Уклад М. М. Улашчыка ў гістарыяграфію гісторыі Беларусі, крыніцазнаўства, археаграфію (старшыні — В. У. Скалабан, Э. Р. Іофе; сакратар— В. С. Іванова).

Секцыя 2. Актуальныя праблемы развіцця крыніцазнаўства і гістарыяграфіі.

Падсекцыя 2.1. Старажытнасць і сярэднявечча (старшыні — П. У. Церашковіч, С. В. Марозава; сакратар — Л. Ю. Казакоў). Падсекцыя 2.2. Новы і навейшы час (старшыні — А. Г. Каханоўскі, Э. М. Савіцкі; сакратар —М. А. Папоў).

Секцыя 3. Тэарэтычныя і метадычныя праблемы архівазнаўства і археаграфіі (старшыні — У. В. Фядосаў, В. Дз. Банасюкевіч; сакратар — З. В. Антановіч).

Секцыя 4. Праблемы прафесійнай падрыхтоўкі гісторыкаў і архівістаў.

Прапаганда гістарычных ведаў (старшыні — А. А. Гужалоўскі, С. І. Міхальчанка; сакратар — С. М. Лагун).

25 лютага з раніцы былі падведзены вынікі працы канферэнцыі, заслуханы даклады кіраўнікоў секцый, выпрацаваны праект рашэння канферэнцыі.

У 12 гадзін дня група навукоўцаў у складзе Г. Л. Харашкевіч, С. М. Ходзіна, М. Ф. Шумейкі, А. І. Валахановіча, пляменніцы М. М.Улашчыка — Л. І. Іваноўскай выехала ў Дзяржынск, дзе адбыўся працяг навуковай канферэнцыі. У



зале Цэнтральнай раённай бібліятэкі навукоўцы сустрэліся з настаўнікамі гісторыі школ раёна, работнікамі бібліятэкі, Дзяржынскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея, грамадскасцю горада. Перад аўдыторыяй выступілі Г. Л. Харашкевіч, С. М. Ходзін, М. Ф. Шумейка, А. І. Валахановіч, Л. І. Іваноўская, якія расказалі пра М. М. Улашчыка, яго жыццё, навуковую дзейнасць, адказалі на пытанні прысутных. С. М. Ходзін, М. Ф. Шумейка, А. І. Валахановіч падарылі і бібліятэцы, і музею кнігі М. М. Улашчыка, кнігі пра М. М. Улашчыка, газеты з артыкуламі пра яго, кнігі па гісторыі Беларусі, выдадзеныя гістарычным факультэтам БДУ. Гасцям былі прэзентаваны кніга «Памяць. Дзяржынскі раён» і буклеты, прысвечаныя Дзяржынскаму раёну.

Далей шлях ляжаў у вёску Віцкаўшчына — радзіму М. М. Улашчыка. Навукоўцы наведалі могілкі вёскі Віцкаўшчына, дзе пахаваны родныя і сваякі М.М. Улашчыка. У вёсцы Віцкаўшчына хаты, дзе нарадзіўся М. М. Улашчык і ўсе яго браты і сёстры, ужо няма.

Апошні пункт маршруту — вёска Грычына. І Віцкаўшчына, і Грычына — вёскі старажытныя, вельмі добра апісаны Улашчыкам. А сваёй «малой радзіме» ён прысвяціў кнігу «Была такая вёска».

У Грычынскай сярэдняй школе навукоўцаў сустракалі хлебам-соллю. На сустрэчы вучні школы прадставілі мастацкую частку, спявалі песні, былі рады прыезду гасцей.

Перад вучнямі старэйшых класаў і настаўнікамі выступілі Г. Л. Харашкевіч, С. М. Ходзін, М. Ф. Шумейка, А. І. Валахановіч, Л. І. Іваноўская, якія на радзіме слыннага вучонага падвялі вынікі працы Міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка, расказалі пра земляка як таленавітага вучонага — гісторыка, археографа, этнографа, археолага, крыніцазнаўцу, літаратара, пра яго ўклад у развіццё гістарычнай навукі ў Беларусі.

С. М. Ходзін, М. Ф. Шумейка, А. І. Валахановіч падарылі кнігі М. М. Улашчыка, газеты і часопісы пра яго жыццё і навуковую дзейнасць, у тым ліку ў «Беларускім гістарычным часопісе». Са словамі падзякі выступіла дырэктар Грычынскай сярэдняй школы Валянціна Іванаўна Мароз. Групу навукоўцаў праводзілі Таццяна Уладзіміраўна Ермаковіч — вядучы спецыяліст ідэалагічнага аддзела, Яўген Валер’евіч Скарабагаты — вядучы спецыяліст ідэалагічнага аддзела, Анатоль Мікалаевіч Прыстаўка — намеснік загадчыка аддзела культуры райвыканкома, Людміла Альгердаўна Кірэева — старшыня раённага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, намеснік галоўнага рэдактара газеты «Сцяг Кастрычніка» Віктар Рыгоравіч Уранаў. Навукоўцам былі падораны сувеніры, зробленыя вучнямі школы. Госці азнаёміліся з гістарычным кутком — стэндамі, прысвечанымі жыццю і навуковай дзейнасці



М.М. Улашчыка, распісаліся ў кнізе ганаровых гасцей, сфатаграфаваліся на памяць, падпісалі кнігі.

Навуковыя працы Улашчыка дапамагаюць нам сёння ўявіць Беларусь у тыя далёкія мінулыя стагоддзі. І сёння, вывучаючы навуковую спадчыну слыннага земляка, бачачы, якой Беларусь была ў мінулым, мы думаем пра тое, якой Беларусь можа быць у будучым.

Велічны навуковы і жыццёвы подзвіг нашага шаноўнага земляка-энцыклапедыста Мікалая Мікалаевіча Улашчыка — самаадданага патрыёта сваёй Бацькаўшчыны — яркае сведчанне вялікай жыватворнай моцы і неадольнасці беларускага нацыянальнага адраджэння.